# СЛОВА НА ПРЭЗЕНТАЦЫІ

**Наталля Шувагіна-Адамовіч (Мінск)**

## ПРА КНІГУ АЛЕСЯ АДАМОВІЧА «ПРОЖИТО»

Кнігі майго таты — Алеся Адамовіча — выдаваліся пры яго жыцці часта, і многія з яго твораў перакладаліся на розныя мовы.

Прайшло ўжо сем з паловай гадоў пасля яго смерці. За гэты час у Беларусі выйшаў толькі першы том Збору твораў у 1995 г., другі — паабяцалі ў наступным годзе. Пра цяжкі лёс гэтага выдання пісала ў мінулым годзе паважаная «Белорусская деловая газета». Сёлета выйшла ў «Школьнай бібліятэцы» кніга «Я з вогненай вёскі…», але яна надрукавана без фота, без ілюстрацыйнага матэрыялу.

Але існуе Міжнародны Літаратурны фонд, які працуе ва ўсіх краінах СНД, падтрымлівае пісьменнікаў, іх сем'і матэрыяльна. (Дарэчы, Алесь Адамовіч памёр у час суда у абарону Міжнароднага Літфонда). І вось у 1997 г. Літфонд прызначыў пяць штогадовых прэмій — «За честь и достоинство таланта». Першую ўручылі Алесю Адамовічу (пасмяротна). У той жа год яе таксама атрымалі Дз. Ліхачоў, В. Астаф'еў, В. Быкаў, Б. Акуджава (таксама пасмяротна). Прэмія гэтая грашовая. Перадалі ў той год нам дыплом, які падпісалі старшыня Літфонду — У. Огнеў, Р. Галумян (генеральны дырэктар Літфонду), і статуэтку Дон Кіхота. Ведаю, што за гэты час яе ўручылі таксама Б. Слуцкаму, Ч. Айтматаву, Д. Граніну, Э. Куліеву і інш.

Праз два гады пазванілі мне з Літфонду, што там вырашылі выдаць па адной кніжцы кожнага аўтара-лаўрэата — такі эквівалент прэміі. Сказалі: калі хочаце мець выданне, складайце кнігу.

Першым, я ведаю, выдалі Дз. Ліхачова. Называлася яго кніга «Развитие русской литературы X–XVII веков». Другая была кніга В. Астаф'ева «Веселый солдат», колер яе вокладкі — шэры, колер шынелі, бо пісьменнік быў салдатам на фронце. І вось

трэцяя — кніга А. Адамовіча. Такім чынам складаецца бібліятэка Міжнароднага Літфонду.

Кніга А. Адамовіча «Прожито» — першае пасмяротнае выданне пісьменніка. Гэта ў чымсьці вынíковае, мемарыяльнае выданне, гэтым вызначаны і змест кнігі, на якім я зараз і спынюся.

У апошнія гады жыцця А. Адамовіч напісаў, дакладней, закончыў тры аповесці, якія выдадзены толькі ў часопісным варыянце. Апошняя з іх — «Vixi» — друкавалася нават у трох часопісах: «Дружба народов», «Полымя», «Нёман», у такой жа паслядоўнасці кожны раз аўтар значна дапаўняў яе. Так што пры друкаванні гэтай кнігі мы тэксталагічна, вядома, спыніліся на апошнім прыжыццёвым варыянце часопіса «Нёман», тым больш што ёсць ліст аўтара ў рэдакцыю з устаўкамі, якія ўжо не паспелі ўнесці ў карэктуру. Таму яны ўвайшлі ў гэтае выданне.

У кнізе таксама ёсць два апавяданні, якія блізкія па тэматыцы да аповесці «Vixi»: «Мут» (па-нямецку «мужество») і «Клуб, или Рукописи горят».

Хачу адзначыць, што другое апавяданне доўга не друкавалася, хаця было напісана ў 1964 г. А. Адамовіч дапісаў яго фінал і надрукаваў толькі ў 1986 г. у кніжцы «Аповесці і апавяданні», суправадзіўшы спасылкай: «Рассказ А. Адамовича, как говорится, не ко времени. А. Т. — замечание А. Т. Твардовского на рукописи «Клуба» (1965)».

Пасляслоўе, больш тут падыходзіць — сяброўскае слова Андрэя Нуйкіна, даўняга маскоўскага сябра. Яго сын, Павел Нуйкін, які працуе ў літфондзе, рэдактар гэтай кнігі, вельмі дапамагаў нам у час работы над вёрсткай, праявіў добрую цярплівасць.

Кніга аздоблена фотаздымкамі. Гэта ў асноўным фатаграфіі Яўгена Коктыша, які таксама ўзнавіў і старыя маленькія фота. Увайшло у кнігу 19 фотаздымкаў, яны ілюструюць словы пісьменніка, тэкст кнігі, якая носіць мемуарны характар.




Кніга пачынаецца з цікавага інтэрв'ю, якое ўзяў П. Нуйкін у пісьменніка яшчэ ў 1992 г. А завяршае выданне невялікая бібліяграфія «Асноўныя публікацыі А. Адамовіча на рускай мове», даецца таксама бібліяграфія літаратуры пра пісьменніка. Яна няпоўная — уключаны сюды больш вядомыя аўтары і выданні на рускай мове. Але хачу падкрэсліць, што мы раілі, каб у яе былі таксама ўключаны артыкулы, успаміны беларускіх аўтараў Янкі Брыля, Міхася Тычыны, Віктара Каваленкі, Валянціна Тараса, якія надрукаваны ў часопісе «Нёман» у асноўным у апошнія гады.

Кніга была надрукавана ў ліпені, якраз да сапраўднага 75-годдзя А. Адамовіча. Яна з'явілася падарункам да гэтай даты.

У наступным жа годзе будзе афіцыйная юбілейная дата. Спадзяюся, што да яе выйдуць новыя кнігі таты на беларускай мове, а мабыць, і на польскай: шаноўны Чэслаў Сэнюх пачаў — як ён сказаў — пераклад аповесці «Нямко».

Мы ўсе ўдзячныя Міжнароднаму Літфонду за выданне кнігі. Яна выйшла тыражом у 1000 экз., безганарарная. У продажы яе няма, таму мы дорым, раздаем яе шаноўным людзям, бібліятэкам. Спадзяёмся, што яна зацікавіць і вас і што дзякуючы ёй асоба Алеся Адамовіча стане вам бліжэй.

KAMUNIKAT.org